Настаўніцкая газета
№ 56 (8696), 26 мая 2022 года

# “Ты верны рыцар слоў крывіцкіх...”

Прапануем увазе чытачоў квест па творчасці Уладзіміра Караткевіча.

У квесце ўдзельнічаюць 3 каманды. Для размеркавання гульцоў на каманды прапаноўваецца выцягнуць ліст каштана зялёнага, жоўтага і карычневага колеру. Камандам патрэбна прайсці 4 станцыі і сабраць букет У.Караткевічу. Пасля кожнай станцыі каманды атрымліваюць кветку адпаведнага колеру з часткай выказвання аўтара. У фінале кожная каманда складвае і зачытвае сваё выказванне.

| Станцыя | Магчымыя балы | Набраныя балы |
|---|---|---|
| Біяграфічная | 10 | |
| Лінгвістычная | 10 | |
| Паэтычная | 10 | |
| Малавядомы У.Караткевіч | 10 | |

Выказванні, якія павінны атрымацца ў фінале:

“Жыццё — даброта. Найвялікшая даброта, якая дадзена кожнаму, нягледзячы на ўвесь боль”.

“Кожную кнігу трэба пісаць так, нібы гэта твая лепшая і апошняя”.

“Чалавек, які робіць крыўду другому, у рэшце рэшт крыўдзіць сябе”.

## Станцыя “Біяграфічная”

*Вучням прапаноўваецца гатовы матэрыял пра У.Караткевіча. Задача: аднавіць біяграфію пісьменніка, знайсці адказы на наступныя пытанні. Правільны адказ — 1 бал.*

1. Дзе і калі ўбачыла свет аповесць У.Караткевіча “Загадка Неферціці”? *(1944 г., Орша, школьны рукапісны часопіс “Званочак”.)*

2. Які год лічыцца пачаткам літаратурнай дзейнасці У.Караткевіча? *(1955 г.)*

3. Назавіце асноўны матыў першага паэтычнага зборніка У.Караткевіча. *(“Усе шляхі прыводзяць не да Рыма, а да родных вербаў і бяроз”.)*

4. Інфармацыя пра які паэтычны зборнік адсутнічае ў прапанаваным матэрыяле? *(“Мая Іліяда”.)*

5. Які паэтычны зборнік з’яўляецца запаветам нашчадкам? *(“Быў. Ёсць. Буду”.)*

6. У.Караткевіч стаў першым класікам якой літаратуры? *(Беларуская навукова-мастацкая гістарычная літаратура.)*

7. У якім творы пісьменнік выказаў сваю творчую праграму? *(“Нельга забыць”.)*

8. За які раман У.Караткевіч атрымаў Дзяржаўную прэмію імя Якуба Коласа? *(“Чорны замак Альшанскі”.)*

9. Адзначце творы для дзяцей сярод прапанаваных ілюстрацый. *(“Чортаў скарб”, “Казкі”.)*




10. Знайдзіце радкі, у якіх увасобілася жыццёвае крэда У.Караткевіча?

*(Час стагоддзі, як касой, сцінае,*
*Веры, царствы, догмы йдуць да ценяў…*
*Усё мінае — Гонар не мінае,*
*Бо народжаны адным сумленнем.*
*Калі сонца выб’ецца з туману,*
*Толькі іх і ўспомніць хор народаў,*
*Воінаў сваіх, святых і зраненых,*
*Рыцараў сумлення і свабоды.)*

## Станцыя “Лінгвістычная”

*За кожны правільны адказ — 2 балы.*

**1. У аповесці У.Караткевіча “Лісце каштанаў” герой так расказвае пра сябе:** “Пасля былі вызвалены два невялічкія лапікі Беларусі, і “продка” майго паслалі на вызваленую тэрыторыю, некуды пад Лёзна. Браць мяне з сабою ён (бацька) не захацеў, і мы разумелі чаму, па эзопаўскіх намёках у лістах: “Матылі лётаюць, ды толькі высока…”

*Якім мастацкім прыёмам карыстаецца бацька героя ў лісце? Патлумачце слова, ужытае бацькам.*

**2. У казцы У.Караткевіча сустракаем слова “нукер”:**

“— Уладар! — крыкнуў нукер хану. — Меч не бярэ яго шыі. Гэта святы”.

*Да якога разраду лексікі адносіцца гэтае слова? Патлумачце яго значэнне.*

**3. Расстаўце знакі прыпынку ва ўрыўку з рамана У.Караткевіча “Каласы пад сярпом тваім”:** “І калі бачыш на водмелі напаўзанесенае пяском мокрае бервяно адразу становіцца зразумела адкуль узяў народ паданне аб волатах што спяць засыпаныя жвірам і заплеценыя травой спяць пакуль не прыйдзе час вялікай бяды і пакуль іх не пакліча народ”.

**4. Адзначце стылёвыя адметнасці ўрыўка з казкі У.Караткевіча “Нямоглы бацька”.**

“— Ты чаго гудзіш, як свіння? — раззлаваўся на яго Пятро. — Чаго так пільна хочаш? Крыві чужой?

— Згінуў твой стары грыб. А калі згінуў, трэба яго рваць з коранем. А то ад яго і на здаровыя зараза пойдзе.

Грамада сумуе, але хто галасней крычыць, таго і слухаюць”.

**5. На месцы пропускаў ва ўрыўку з рамана “Каласы пад сярпом тваім” У.Караткевіча ўстаўце часціцу *не* ці *ні* і запішыце яе разам ці асобна:** “Ён, …як адразу і да канца, зразумеў, што цяпер яму …колі …есці хлеба, які падыходзіў у роднай дзяжы, …есці … ў хаце матчынай, … ў сваёй хаце. Маці памерла, яе …колі ўжо …ўбачыць”.

## Станцыя “Малавядомы Караткевіч”

**Гульня “Так ці не”.**

*Умова: камандам варта здагадацца, якія факты адносяцца да жыцця і творчасці У.Караткевіча, а якія — не. Правільны адказ — 1 бал.*

1. Любімая кніга — “Тры мушкецёры” А.Дзюма.

Каля ложка пісьменніка на часопісным століку заўсёды ляжала кніга А.Дзюма “Тры мушкецёры”. Перш чым пачынаць стварэнне новага твора, У.Караткевіч перачытваў любімы твор і натхняўся на новыя ідэі. *(Так.)*

2. Захапляўся мультфільмамі.

У.Караткевіч заўсёды праглядаў праграму тэлеперадач на тыдзень і выдзяляў чырвоным стрыжнем мультфільмы. Глядзеў іх з вялікім захапленнем. Крыўдзіўся, калі родныя не папярэджвалі яго пра сеанс. *(Так.)*

3. Любіў плаваць.

Ён настолькі любіў ваду, што мог у ёй сядзець гадзінамі і заплываць вельмі далёка. *(Так.)*

4. Мог загінуць студэнтам, калі б не выпадковасць.

Аднойчы ў Кіеве У.Караткевіч вырашыў пад’ехаць на трамваі без білета. Але кантралёр з ганьбай выставіла яго з трамвая. Пасля чаго трамвай даехаў да скрыжавання і схаваўся за дамамі. Якраз у той момант адбылася аварыя. Трамвай сышоў з рэек. Многія людзі загінулі, асобныя былі паранены. *(Так.)*

5. Быў вялікі фантазёр не толькі ў кнігах, але і ў жыцці.

Аднойчы сустрэўся У.Караткевіч з В.Быкавым. У першага была рука зламана. Уладзімір Сямёнавіч расказаў, што сустрэў пяць хуліганаў, якія чапляліся да дзяўчыны. Вось ён і дапамог ёй. На наступны дзень В.Быкаў даведаўся, што У.Караткевіч проста зваліўся з лесвіцы і зламаў руку. *(Так.)*

6. Яго першая прафесія — паштальён.

Адразу пасля Вялікай Айчыннай вайны ўладкаваўся працаваць паштальёнам у калгасе. *(Не. Н.Гілевіч.)*

7. Мог стаць мастаком ці скульптарам.

Пасля заканчэння школы паступіў на скульптурнае аддзяленне Віцебскага мастацкага вучылішча, правучыўся там толькі адзін год. *(Не. В.Быкаў.)*

8. Пісьменніка памылкова “пахавалі” падчас вайны і ўшанавалі на помнікавым абеліску.

У.Караткевіч быў цяжка паранены ў плячо і жывот. Родныя атрымалі “пахаванку”. Яго імя засведчана на абеліску на Украіне. *(Не. В.Быкаў.)*

9. Умеў насіць кнігі на галаве.

У дзяцінстве навучыўся насіць на галаве стос кніг. Гэта не вельмі падабалася бацьку, які часта яго дакараў. *(Не. І.Шамякін.)*

10. Першы твор напісаў левай рукой.

Упершыню пісаць пачаў падчас Вялікай Айчыннай вайны. У.Караткевіч знаходзіўся ў Тбілісі ў шпіталі пасля ранення, таму першае сваё апавяданне напісаў левай рукой. *(Не. І.Мележ.)*

## Станцыя “Паэтычная”

*За кожны правільны адказ — 2 балы.*

**1. Гульня “Падбяры рыфму”.**

*Падбярыце рыфму да слоў: смех, год, сябры, спадчына, казка, драма, гісторыя.*

**2. “Хвіліна творчасці”.**

*Складзіце вершаваныя радкі па апорных словах:*



| | | |
|---|---|---|
| 1) гісторыя | 2) час | 3) патрыёт |
| алегорыя | нас | народ |
| сюжэты | мова | краіну |
| сакрэты | слова | хвіліну |

**3. “Цыферблат”.**

*Замест лічбаў на гэтым цыферблаце размешчаны літары. Паспрабуйце разабрацца ў іх, каб правільна прачытаць назву паэтычнага зборніка У.Караткевіча.*

*1-я падказка: 12, 6, 3, 9,10, 5, 7, 6, 12, 1, 4, 10, 8, 11, 7.*

*2-я падказка: 12, 2, 4, 3, 9, 1, 2, 7, 11, 5, 2.*

1 2




**4. Прадоўжыце вершы.**

*1. Дагарэў за брамай…*
Месяц паміж воблачкаў плыве,
*Выйду зноў, як у мінулы…*
*Басанож прайдуся па…*

2. Восень прайшла пералескамі
*Па няголеным ржышчы…*
Чырвонымі арабескамі
*Лісце лес…*

3. Дзе мой край? Там, дзе
*вечную песню…*
*Там, дзе Нёман на захадзе*
*помніць…*
Дзе на ўзвышшах
Наваградскіх дрэмлюць
*суровыя..*
І вішнёвыя хаты глядзяцца
*ў шырокі..*

4. Кнігі — сябры.
Іх кідаюць перш за ўсё.
*Але ў сэрцы яны…*
Як памяць нятленная.
*Бо яны — гэта…*

5. О любоў мая, Беларусь!
Над туманным начным стаўком
Пралятае самотная гусь,
*Разразаючы люстра…*

**5. Размяркуйце творы ў табліцы па жанравай прыналежнасці.**

| Назва твора | Жанр |
|---|---|
| 1. “Кастусь Каліноўскі” | |
| 2. “Дзікае паляванне караля Стаха” | |
| 3. “Лебядзіны скіт” | |
| 4. “Чортаў скарб” | |
| 5. “Кніганошы” | |
| 6. “Каласы пад сярпом тваім” | |
| 7. “Бацькаўшчына” | |
| 8. “Мова” | |

**Рэфлексія.**

Падабраць на кожную літару прозвішча аўтара адпаведнік, які яго дакладна характарызуе.

**Таццяна АЛЯКСЕЕВА,**
*намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце Акцябрскай сярэдняй школы Віцебскага раёна імя І.П.Собалева;*
**Жанна ДАДЭРКІНА,**
*настаўніца беларускай мовы і літаратуры сярэдняй школы № 12 Віцебска імя Л.М.Філіпенкі.*